Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

25 МАЯ 2019 г. СУБОТА № 96 (28963)

ЗВЯЗДА

Фота БелТА.

ПА СТАЛІЧНАЙ «АРБІЦЕ»

Вынікі інспекцыі кальцавой пад кіраўніцтвам Прэзідэнта

Учора ў першай палове дня ўдзельнікі дарожнага руху на Мінскай кальцавой аўтадарозе маглі сустрэць незвычайны картэж на чале з вялікім турыстычным аўтобусам. Абганяючы калону, якая рухалася трохі павольней хуткасці патоку, аўтамабілісты і іх пасажыры наўрад ці маглі здагадацца, што ў аўтобусе едзе Аляксандр Лукашэнка. А трэба было толькі павярнуць галаву! Прэзідэнт асабіста інспектаваў стан МКАД і навакольную інфраструктуру. Наш карэспандэнт ехаў у адным аўтобусе з кіраўніком дзяржавы і змог убачыць усе нюансы высокай інспекцыі.

Фота БелТА.

Думаю, няшмат хто можа сказаць, што за адзін раз праехаў Мінскую кальцавую аўтадарогу цалкам. Мала хто рабіў гэта з мэтай вывучэння сітуацыі на МКАД і побач з ёй. І канешне, яшчэ лепш здзейсніці гэта ў адным аўтобусе з Прэзідэнтам краіны. Больш за 56 кіламетраў шляху — а менавіта столькі складае даўжыня кальцавой — кіраўнік дзяржавы і чыноўнікі пераадолелі ў адным аўтобусе «МАЗ» разам з журналістамі.

«Напэўна, рух на МКАД спыніўся на гэты час?» — задасца пытаннем чытач. Аднак, паколькі інспекцыя праводзілася ў першай палове пятніцы, зачыняць такую важную магістраль для мінчан і гасцей сталіцы было б няправільна. Таму аўтобус з першай асобай спакойна ўключыўся ў немалы, як заўсёды, паток аўтамабіляў на кальцавой. І трэба прызнаць, што асобныя вадзіцелі фур былі крыху збянтэжаныя, калі бачылі ў акне высокага турыстычнага аўтобуса кіраўніка дзяржавы. Пра што ж казаў беларускі лідар падчас паездкі, і як прайшла інспекцыя?

Дарога — горад — краіна

...Непрыкметны з'езд з трасы М3 на ўездзе ў Бараўляны, невялікая паркоўка — менавіта тут пачалося вывучэнне Прэзідэнтам добраўпарадкавання і развіцця тэрыторый уздоўж Мінскай кальцавой аўтадарогі.

Як толькі кіраўнік дзяржавы прыбыў на месца, ён адразу пазначыў тэму сустрэчы. Беларускі лідар нагадаў, што часта крытыкуе чыноўнікаў за дарогі і парадак, а таксама за тыя кірункі дзейнасці, якія звязаны з прыродай. Паводле яго слоў, МКАД — гэта твар Мінска, а Мінск — гэта твар краіны.

«Тут госці, людзі часта ездзяць па гэтых дарогах, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — І справа нават не толькі ў тым, што хутка прыедзе шмат гасцей з усяго свету на Еўрапейскія гульні. Калісьці трэба было гэтую працу актывізаваць».

Звяртаючыся да чыноўнікаў, ён нагадаў, што не раз казаў пра тое, што хацеў бы бачыць уздоўж гэтых дарог. І які вынік? На думку Прэзідэнта, пакуль праца ідзе так сабе. Пры гэтым ён прызнаў, што можа нешта не бачыць, бо нельга пабываць усюды.

«І сёння я хацеў бы проста вам усім пазначыць канкрэтна, якой павінна быць дарога і прыдарожныя ўчасткі», — патлумачыў сутнасць сваёй інспекцыі беларускі лідар.

Трэба разумець, што праца па добраўпарадкаванні не скончыцца пасля буйнога спартыўнага першынства, яна павінна працягвацца. На гэта кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу: «Напэўна, пачнём з асноўных дарог і пойдзем да межаў нашай краіны. Трэба добраўпарадкоўваць Беларусь, нельга спыняцца. Гэта наша «фішка». Хто б сюды ні прыязджаў, усе ахкаюць, як добра, прырода добрая. Але прыродзе трэба не толькі радавацца, не толькі жыць з ёй у міры і згодзе — прыроду трэба і ўпрыгожваць, удасканальваць».

Дарэчы, пакуль чакалі прыезд Прэзідэнта, перад тым як адправіцца на інспекцыю, на некалькі пытанняў пагадзіўся адказаць мэр Мінска Анатоль СІВАК — і ён таксама казаў пра тое, што праца па азеляненні і рамонце дарог з'яўляецца планавай. Ён таксама паведаміў, што ў сталіцы сёлета плануецца высадзіць 8-9 мільёнаў кветак, хоць годам раней высадзілі ўсяго два мільёны. Статыстыка змянілася ў лепшы бок і па дарогах — паклалі больш асфальту, у многіх месцах памянялі тратуарную плітку... Пры гэтым мэр заўважыў, што падчас будаўніцтва новага нельга забываць пра падтрыманне парадку ў старым.

Папярэджанне для нядобрасумленных інвестараў

Безумоўна, Прэзідэнту далажылі аб сітуацыі: пра тое, як выконваюцца яго даручэнні па падтрыманні МКАД і развязак у добрым стане, а таксама аб добраўпарадкаванні тэрыторый каля кальцавой.

Закранулі няпростую тэму недабудаваных будынкаў. Пазіцыя Аляксандра Лукашэнкі тут жорсткая: калі з інвестарам дамовіліся, ён павінен выконваць свае абавязацельствы. Калі ж ён не выконвае, то трэба выкарыстоўваць жорсткія санкцыі. Не зрабіў — нясі адказнасць.

Што датычыцца тэрмінаў будаўніцтва і вонкавага добраўпарадкавання аб'ектаў, то тут ёсць велічыня, на якую варта арыентавацца. На думку беларускага лідара, тры гады — гэта максімальны тэрмін для такой дзейнасці. Бо ў нас як бывае: будоўля доўжыцца і пяць, і сем гадоў, вакол бруд, людзям непрыемна. Так што інвестар павінен памятаць пра насельніцтва, зрабіць нармальна вонкава і добраўпарадкаваць зямлю. Усё астатняе — на яго сумленні.

Даручэнне кіраўніка дзяржавы: навесці тут парадак, паглядзець гэтае пытанне, у некаторых варта нават забраць участкі (на якіх цяпер стаяць даўгабуды), каб іншым непанадна было.

У адказ старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка распавёў, што такі падыход ужо дае вынік: як толькі пачалі адабранне ўчасткаў з даўгабудамі, інвестары паскорылі ўзвядзенне запланаваных аб'ектаў.

Будучыня = электрычнасць

Яшчэ на невялікай паркоўцы акуратна размясціўся транспарт, які будзе актыўна выкарыстоўвацца падчас Еўрапейскіх гульняў. Пяць машын з сімволікай першынства — два аўтобусы МАЗ, «Нёман», а таксама два Geely Atlas белага і чорнага колераў. Такі аўтапарк (вядома, у большай колькасці) здольны вырашыць транспартнае пытанне падчас чэмпіянату. Дарэчы, 320 беларускіх красавераў будуць эксплуатавацца ў якасці таксі для прадстаўнічых гасцей.

Звярнуў увагу на транспарт і Аляксандр Лукашэнка. Размаўляючы з кіроўцамі, кіраўнік дзяржавы расказаў, што яму падабаецца мадэль Atlas. Вердыкт Прэзідэнта — «прыстойная машына». І ў чарговы раз ён закрануў тэму электрамабіляў — такую вытворчасць развіваць неабходна.

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка і чыноўнікі рушылі ў бок кальцавой.

Дрэвам — так, плоту — не

Як толькі аўтобус крануўся, Прэзідэнт заклікаў рухацца павольней, каб старанна разгледзець усё вакол. Кіраўнік дзяржавы адразу папярэдзіў: схілы ўздоўж дарогі павінны быць засаджаны дрэвамі (хоць бы елкамі, хвоямі), каб не касіць, бо гэта немалыя затраты.

«Уздоўж дарог павінны быць зялёныя насаджэнні», — падкрэсліў ён і дадаў, што абавязкова асабіста праедзецца і паглядзіць на стан пасаджаных дрэў і хмызнякоў, бо сэнсу ў загінулым насаджэнні няма ніякага. Калі нешта загінула — трэба прыбіраць і засаджваць нанова, а потым даглядаць.

«І трэба спытаць тых, хто іх высаджваў, таму што гэта галавацяпства. Калі б гэта адно дрэва з 10—15 прапала, гэта яшчэ дапушчальна, але калі праз адно загінулі дрэвы, гэта ненармальна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Таксама ён звярнуў увагу на недапушчальнасць залішняга выразання і выпілоўвання.

На думку беларускага лідара, калі ў населеным пункце жылыя дамы прымыкаюць да дарогі, то яе трэба больш засадзіць, аднак усё гэта не павінна зарастаць. Вядома, і фасады дамоў павінны быць у годным стане. І, дарэчы, займацца гэтым маглі б самі жыхары. Таксама Аляксандр Лукашэнка заклікаў рэстараны, запраўкі, крамы і іншыя ўстановы ўздоўж дарогі самастойна займацца сваёй тэрыторыяй. «Гэта іх зона адказнасці», — рэзюмаваў ён.

СТАР. 2

Узровень

ВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ ХІРУРГІІ

Як у Беларусі трансплантуюць органы і чаму да нас на аперацыі едуць замежнікі

54-гадовую японку Сецуко і аднагадовую беларускую дзяўчынку з Бабруйска Марыяну аб'ядноўвае адна няпростая жыццёвая акалічнасць: яны перажылі перасадку печані ў сталічным навукова-практычным цэнтры хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі і зараз аднаўляюцца ў рэанімацыі. Хутчэй за ўсё, яны б ніколі ў жыцці не сустрэліся, калі б абедзвюм не спатрэбілася дапамога беларускіх трансплантолагаў, пра якіх ведаюць, як паказвае практыка, далёка за межамі нашай краіны.

minsknews.by

Шанц на выжыванне

Японка Сецуко перажыла першую трансплантацыю печані ў адной з клінік Кітая. Але ад інфекцыі, на якую перахварэла жанчына, перасаджаны орган загінуў. На складаную паўторную перасадку жанчыне парэкамендаваў ехаць у Беларусь японскі прафесар. І нашы медыкі літаральна падарылі ёй другое жыццё.

— Сецуко прыехала ў Беларусь яшчэ ў лістападзе мінулага года, чакала аперацыю, мы шукалі падыходзячы донарскі орган, — расказвае **дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег РУМО.** — У сакавіку ёй зрабілі аперацыю — паўторную перасадку печані. Яна пайшла на папраўку, і на сярэдзіну красавіка ў яе нават быў білет на самалёт дадому. Аднак зноў развілася ўскладненне, і мы змясцілі яе ў рэанімацыю. Зараз сітуацыя стабілізавалася.

СТАР. 2

Сацыяльны клопат

КАБ МІНСК СТАЎ ЗРУЧНЫМ ДЛЯ ЎСІХ

Для гэтага гарадская інфраструктура павінна ўлічваць патрэбы кожнага

У Мінску цяпер пражывае амаль 125 тысяч асоб з інваліднасцю (або 6,3 % ад агульнага ліку мінчан). Гэта людзі, якія адчуваюць цяжкасці пры самастойным перамяшчэнні, атрыманні паслуг, інфармацыі, пры арыентаванні ў прасторы. Наколькі наша сталіца камфортная для іх, ці створаны ў горадзе ўмовы для таго, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі маглі весці паўнавартаснае жыццё?

Яшчэ нейкіх шэсць-сем гадоў таму людзі з абмежаванымі магчымасцямі без старонняй дапамогі не маглі выйсці на вуліцу са сваёй кватэры ў шматпавярхоўцы, ім складана было трапіць у краму ці ў дзяржустанову. А спусціцца ў метрапалітэн і зусім было нерэальна: не было ні пандусаў, ні пад'ёмнікаў.

Цяпер 57,3 % аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры Мінска забяспечаны элементамі безбар'ернага асяроддзя, — кажа **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ,** удакладніўшы, што пад элементамі безбар'ернага асяроддзя цяпер разумеецца комплексны падыход — пачынаючы ад паркоўкі і заканчваючы асяроддзем унутры будынка. На гэты год запланавана стварыць безбар'ернае асяроддзе яшчэ на 150 аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры і па месцы жыхарства людзей з інваліднасцю.

СТАР. 7

Вытокі малой радзімы

ЁСЦЬ ТАКАЯ КРЫНІЦА — ГАРАДЫ

На Мазыршчыне ахоўваюць крыніцы, стараюцца захаваць і абазначыць гэтыя гаючыя вытокі — так, напрыклад, як у вёсках Лучажэвічы, Скрыгалаў, Мазуры, Каменка, Акулінка, Раманаўка, Хамічкі, Чырвоная Горка. Ёсць у крыніц і назвы, як, напрыклад, Альховіца ў вёсцы Васькоўка, Кустоўніца ў пасёлку Крынічнае, Добрыца ў вёсцы Нагорная. Несумненна, усе гэтыя вытокі вельмі старажытныя, авеяныя легендамі. За вёскай Маісеевічы, у лесе, сярод пагоркаў бруіцца крыніца з цікавай назвай Гарады. Яна паходзіць ад слова «гарадзішча», якое па-мясцоваму называюць «горадам», і якіх тут некалькі.

Яшчэ адной крыніцай — жывой памяці — з'яўляецца захаваная мясцовая адметнасць, якая бачыцца нават у жаночым святочным строі — адзенні, якое паляшучкі насілі яшчэ зусім нядаўна, у пяцідзясятых і шасцідзясятых гадах мінулага стагоддзя, і якое цяпер рэдка калі ўбачыш. Дырэктар Маісеевіцкага Дома культуры Лідзія НІКАНОВІЧ захавала сапраўдны аўтэнтычны тканы і вышываны шэдэўр, які застаўся ад яе свякрухі, а мастацкі кіраўнік Зінаіда ПІНЧУК *(на фота)* любіць апранаць яго на канцэрты і святы, урачыстыя вечары і традыцыйныя народныя вясковыя гулянні, дэманструе ў ім красу і самабытнасць Палесся.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Тэрэза Мэй сыдзе ў адстаўку 7 чэрвеня

Тэрэза Мэй абвясціла, што прыняла рашэнне сысці ў адстаўку з пасады лідара кіруючай у Вялікабрытаніі кансерватыўнай партыі і, адпаведна, прэм'ер-міністра. Такую заяву яна зрабіла ў пятніцу на парозе сваёй афіцыйнай рэзідэнцыі на Даўнінг-стрыт, 10.

«Сёння я паведамляю, што пайду ў адстаўку ў якасці лідара кансерватыўнай і юніянісцкай партыі ў пятніцу, 7 чэрвеня», — сказала Мэй.

Не Сіндза Абэ, а — Абэ Сіндза. Токіа заклапаціўся выпраўленнем імёнаў

Спачатку прозвішча, потым — імя. Менавіта такі парадак выкарыстоўваецца ў японскай мове пры напісанні імёнаў. Але ў большасці іншых краін ужо даўно прывыклі да іншай паслядоўнасці — спачатку імя, потым прозвішча. Як так атрымалася і навошта Токіа гэта хоча выправіць?

21 мая кіраўнік МЗС Японіі Тара Кона заявіў, што мае намер звярнуцца да замежных сродкаў масавай інфармацыі з просьбай пісаць японскія імёны замежнымі літарамі ў аднолькавым парадку — спачатку прозвішча, а потым асабістае імя. Зараз, на думку міністра, надышоў самы ўдалы час для перамен, бо ў краіне надышла новая эпоха — Рэйва («Прыгожай гармоніі»). Да таго ж хутка ў Японіі пройдзе некалькі важных міжнародных падзей (саміт G20, Алімпійскія гульні), на якіх можна было б замацаваць новае напісанне.

Тара Кона нагадаў, што замежныя СМІ прыводзяць кітайскія і карэйскія імёны менавіта ў такім парадку: спачатку радавое прозвішча, потым — асабістае імя (Сі Цзіньпін, Мун Чжэ Ін і г. д.). «Таму пажадана, каб і імя прэм'ер-міністра Японіі няўхільна пісалі Абэ Сіндза, а не Сіндза Абэ, як цяпер», — падкрэсліў міністр.

Экс-прэзідэнт Аргенціны можа паўстаць перад судом з-за скрадзенага гістарычнага пісьма

Аргенцінскі суддзя Клаўдыа Банадыа папрасіў пракуратуру падрыхтаваць паперы, неабходныя для пачатку судовых слуханняў па справе аб выкрадзеных гістарычных дакументах, знойдзеных у доме сенатара і экс-прэзідэнта Крысціны Фернандэс дэ Кіршнер. Пра гэта паведаміў учора Цэнтр судовай інфармацыі.

Гаворка ідзе пра нататнік экс-прэзідэнта Аргенціны Іпаліта Ірыгаена (1916—1922) і ліст змагара за незалежнасць у Лацінскай Амерыцы Хасэ дэ Сан-Марціна яго чылійскаму аднадумцу Бернарда О'Хігінсу, датаваны 1835 годам. Абодва дакументы былі знойдзены ў доме Фернандэс дэ Кіршнер падчас вобыску па справе аб карупцыі ў верасні 2018 года. Як выявіла следства, запісная кніжка і ліст былі скрадзены з дзяржаўных архіваў Аргенціны і Чылі адпаведна.

На думку Банадыа, расследаванне справы, якое павінна папярэднічаць судовым пасяджэнням, ужо завершана. Цяпер пракуратура і абарона экс-кіраўніка дзяржавы павінны падрыхтаваць дакументы, на падставе якіх суд прыме рашэнне аб пачатку слуханняў.

Банадыа вылучыў у дачыненні да Фернандэс дэ Кіршнер абвінавачванні па артыкуле «ўтойванне, знішчэнне або незаконны вываз гістарычных дакументаў».

ISSN 1990 - 763X

Чулі?!

ЯШЧЭ АДЗІН ЧЭМПІЯНАТ У СКАРБОНЦЫ

Беларусь прыме маладзёжнае першынства па хакеі ў дывізіёне ІА

У барацьбе за гэта права беларуская дэлегацыя апярэдзіла аўстрыйскую. Гэта стала вядома на кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея, які праходзіў у Браціславе.

«Права стаць гаспадарамі гэтага турніру разам з нашай першапачаткова мелі намер аспрэчваць яшчэ тры федэрацыі: Аўстрыі, Даніі і Славеніі. Але дзве апошнія дэлегацыі ў выніку знялі кандыдатуры, прычым датчане — на карысць нашай краіны. У беларуска-аўстрыйскай спрэчцы большасцю галасоў (16 супраць 9) перамагла заяўка ФХБ. Турнір пройдзе з 8 да 14 снежня гэтага года. За адзіную пуцёўку ў топ-10 сусветнага маладзёжнага хакея на беларускім лёдзе будуць змагацца гаспадары, а таксама зборныя U-20 Даніі, Аўстрыі, Латвіі, Славеніі і Нарвегіі», — гаворыцца на сайце Беларускай федэрацыі хакея.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Я зноў выбіраю «Звязду»

Вывучыць мову дапамагла газета

Іван ПЯТРОЎСКІ, што жыве ў аграгарадку Будслаў Мядзельскага раёна, карыстаецца аўтарытэтам сярод землякоў.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

Іван Станіслававіч працаваў на розных пасадах у мясцовым калгасе, апошнія дзевяць гадоў кіраваў адкрытым акцыянерным таварыствам «Будслаўскае». Яшчэ з таго часу зарэкамендаваў сябе як добры арганізатар, шчыры і чулы да патрэб людзей чалавек, да якога можна заўжды звярнуцца па дапамогу. Цяпер Іван Пятроўскі на пенсіі, але не сядзіць склаўшы рукі. Можна сказаць, ён грамадскі дзеяч мясцовага маштабу, актывіст, які арганізоўвае землякоў і на суботнікі, і на добраўпарадкаванне вёскі. Ды і сам актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах. На трактары, які калісьці змайстраваў са спісаных дэталяў і вузлоў, дапаможа расчысціць ад лісця парк, вывезці смецце на звалку. Ужо каторае скліканне землякі выбіраюць яго дэпутатам Будслаўскага сельскага Савета дэпутатаў.

Прыемна здзівіла пры сустрэчы тое, што размаўляе Іван Станіслававіч на чыстай беларускай мове.

— «Звязда» мне дапамагла вывучыць і палюбіць матчыну мову. Я даўні прыхільнік вашай газеты. А пачалося наша сяброўства даўно, мабыць, гадоў сорак таму. У савецкі час я быў парторгам. Раённае начальства прымушала выпісваць «Звязду» на партарганізацыю, бо тут друкаваліся партыйныя дакументы, справаздачы і пастановы з пленумаў, з'ездаў. Чытаючы гэтыя матэрыялы, цікавіўся адначасова іншымі артыкуламі. І паступова палюбіў газету, прывязаўся да яе, выпісаў асабіста. А затым пачаў размаўляць па-беларуску. Спачатку нясмела, а затым усё больш упэўнена. Мне падабаецца, што выданне прапагандуе роднае слова, народную творчасць, прывівае любоў да спадчыны, абрадаў нашых продкаў. Вельмі падабаюцца рубрыкі «Спытайце пра радзіннае», «Размаўляем па-беларуску».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.